# Да 75-годдзя

## Марыі Сіланцьеўны Шаўчонак



Дарагая Марыя Сіланцьеўна!
У дзень Вашага 75-годдзя нас, Вашых калегаў па пісьменніцкай арганізацыі перапаўняюць светлыя, шчырыя пачуцці ўдзячнасці за Вашу творчасць і павагі да Вас як да вядомага, самабытнага майстра беларускай паэзіі, энтузіяста і ветэрана літаратурнага руху на Гродзеншчыне і ў рэспубліцы. ...Так, час не стаіць на месцы; на жаль, мы не становімся маладзей. Але Вам удалося захаваць на высокім узроўні самае галоўнае, тое, дзеля чаго мы прыходзім у гэты свет – пачуццё чалавечай годнасці, пранесці праз усё жыццё вернасць уласным ідэалам творцы і грамадзяніна. Нездарма Вашымі прыярытэтамі заўсёды былі бясцэнныя чалавечыя якасці: дабрыня і ўвага да людзей, любоў да Радзімы і Слова, якое для Вас, журналіста і паэтэсы, стала справай усяго жыцця. Марыя Сіланцьеўна! У сувязі з 75-годдзем прыміце ад нас сардэчныя віншаванні і пажаданні здароўя, бясконцага святла ў душы і за акном. Няхай кожнае імгненне Вашага жыцця будзе момантам шчасця і адкрыццяў, няхай не пакідае вера ў сябе і Божую апеку. Натхнення, новых творчых здзяйсненняў Вам і як мага больш нагод для радасці! ВІНШУЕМ!



Калектыў
Гродзенскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

*11 мая 2019 года*